**Білет 10**

**Практычнае заданне.**
**Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці беларускага народа.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Як называецца помнік, узведзены ў гонар вызвалення БССР ад нацысцкіх захопнікаў?
2. Ці згодны вы са сцвярджэннем, што ў Беларусі захоўваецца памяць аб Вялікай Айчыннай вайне і як аб трагедыі, і як гераічным подзвігу беларускага народа? Прывядзіце факты, якія пацвярджаюць гэтае меркаванне.
3. Сфармулюйце два тэзісы, якія пацвярджаюць, што захаванне памяці аб Вялікай Айчыннай вайне – гэта дзяржаўная палітыка Рэспублікі Беларусь.
4. «У нашай гісторыі не было больш яркай і вялікай падзеі, чым перамога над фашызмам. І пакуль людзі памятаюць гэта і ганарацца подзвігам пакалення, якое адстаяла незалежнасць нашай Радзімы, якое выратавала свет ад фашызму, мы ў бяспецы» (А.Р. Лукашэнка). Растлумачце, чаму важна памятаць і ганарыцца Перамогай савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне?

**I. З выступлення Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка на міжнародным патрыятычным форуме Саюзнай дзяржавы "Вялікая спадчына - агульная будучыня"** *(г. Валгаград, 29 красавіка 2025 г.)*

«…Сёння ў прыбалтыйскіх краінах і ва Украіне моладзь размахвае сцягамі дывізій СС, ставіць помнікі фашысцкім катам. Польшча праводзіць мерапрыемствы, прымеркаваныя да вызвалення Чырвонай Арміяй вязняў Асвенцыма, без нашага ўдзелу. У нямецкіх СМІ паведамляюць аб тым, што гэты канцлагер вызвалілі амерыканскія войскі. Словам, робіцца ўсё, каб сцерці памяць аб Вялікай Перамозе, аб нашых пераможцах.

У Беларусі памяць аб Вялікай Перамозе - гэта частка нацыянальнай ідэі. Мы стараемся рабіць усё, каб нашыя дзеці памяталі, што гэтай Перамогай мы моцна звязаныя з рускім народам, усімі народамі былога Савецкага Саюза. Нам гэта нельга згубіць. Таму што разам мы - наймагутнейшая сіла. І нас ніколі не перамагчы…..

Чаму мы так змагаемся за захаванне праўды, гістарычнай памяці? Па-першае, гэтай памяццю мы павінны ганарыцца…. Па-другое. Бо пачалася новая вайна. Яна ідзе ў сродках масавай інфармацыі. Ідзе вайна за розум нашых людзей. Таму мы павінны, зубамі ўчапіўшыся, трымацца за гістарычную памяць… Як толькі забудзем шлях да Хатыні, Сталінграда, Брэсцкай крэпасці, усё вернецца зноў, імгненна…».

**II. З Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь** *(у рэдакцыі ад 15.03.2022)*

Артыкул 15. Дзяржава адказная за захаванне гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, свабоднае развіццё культур ўсіх нацыянальных супольнасцей, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь.

Дзяржава забяспечвае захаванне гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Артыкул 54. Кожны абавязаны берагчы гісторыка-культурную, духоўную спадчыну і іншыя нацыянальныя каштоўнасці.

Захаванне гістарычнай памяці аб гераічным мінулым беларускага народа, патрыятызм з'яўляюцца абавязкам кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

**III. Захаванне гістарычнай памяці** *(па матэрыялах вучэбных дапаможнікаў:*
*"Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны", "Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны", "Гісторыя Беларусі, 1917 г. - пачатак XXI ст." 9 клас*).

У розных кутках Беларусі, якая страціла ў 1941-1945 гадах кожнага трэцяга жыхара, створаны мемарыяльныя комплексы, устаноўлены манументы, прысвечаныя падзеям самай трагічнай і кровапралітнай вайны на нашай шматпакутнай зямлі.

Сёння ў краіне каля 9 тыс. помнікаў і пахаванняў Вялікай Айчыннай вайны. Яны ўваходзяць у ваенна-гістарычныя маршруты і экскурсіі, але галоўнае - з'яўляюцца святым месцам шанавання загінуўшых, вечным напамінам аб тым, як важны мір.

Сусветную вядомасць атрымаў мемарыяльны архітэктурна-скульптурны комплекс "Хатынь". Ён створаны ў Лагойскім раёне Мінскай вобласці як сімвал увекавечання памяці жыхароў вёскі Хатынь, а таксама іншых беларускіх вёсак, спаленых гітлераўскімі варварамі разам з жыхарамі ў 1941–1944 гг.

Першы на Еўрапейскім кантыненце мемарыяльны комплекс, прысвечаны дзецям-ахвярам вайны, адкрыты ў пасёлку Чырвоны Бераг (Жлобінскі раён Гомельскай вобласці). Тут акупантамі быў створаны зборны пункт для дзяцей ва ўзросце ад 8 да 14 гадоў, якіх адпраўлялі ў Германію ў якасці донараў.

Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь працягвае расследаванне крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд. Штодня ўстанаўліваюцца новыя факты злачынстваў нацысцкіх акупантаў і іх памагатых. Да ўзбуджэння крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа было вядома аб 9200 спаленых населеных пунктах. У ходзе расследавання атрыманы звесткі аб спаленні не менш як 12868 сельскіх населеных пунктаў. 290 вёсак Беларусі падзялілі трагічны лёс Хатыні.

У Беларусі створана шмат мемарыяльных комплексаў, якія ўвекавечваюць подзвігі савецкіх воінаў і партызан. Гэта Брэсцкая крэпасць-герой, мемарыяльны комплекс «Прарыў» каля гарадскога пасёлка Ушачы на месцы легендарнага прарыву варожай блакады партызанамі ў красавіку - маі 1944 г., Курган Славы Савецкай Арміі - вызваліцельніцы Беларусі на 21-м кіламетры шашы Мінск - Масква ў гонар подзвігу 1, 2, 3-га Беларускіх і 1-га Прыбалтыйскага франтоў, якія вызвалялі Беларусь, Манумент Перамогі ў цэнтры Мінску, які сімвалізуе перамогу савецкага народа над нацысцкай Германіяй.